# Спадчынная зямля

**Агледзьцеся навокал, вызначце праблемы і абмяркуйце будучыню**

Ужо на гэтым этапе міжнародныя арганізацыі гатовыя падтрымаць вёску, сельсавет, горад альбо цэлы раён. У тым ліку грашыма

У Беларусі стартаваў сумесны праект Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН "Падтрымка навакольнага асяроддзя і ўстойлівага развіцця ў Беларусі". Праект разлічаны на два гады, яго бюджэт — 1,7 млн еўра. Нацыянальным выканаўцам яго выступае Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Праект мае тры часткі. Першая накіравана на больш якасную экалагічную абарону нашай краіны ў цэлым і мае назву "Пабудова патэнцыялу ў галіне Стратэгічнай экалагічнай ацэнкі і ў галіне рэалізацыі прыродаахоўных канвенцый у Рэспубліцы Беларусь". Яе мэтай павінна стаць практыка, калі любая дзяржаўная альбо рэгіянальная праграма яшчэ на стадыі праектавання атрымлівае ацэнку і рэкамендацыі эколагаў з пункту погляду далёкіх па часе наступстваў.

Другая частка яшчэ знаходзіцца на стадыі зацвярджэння і называецца "Зялёныя школы ў Беларусі". Размова ідзе пра экалагічную адукацыю дзяцей. "Звязда" плануе больш падрабязна расказаць пра гэту частку пазней, калі яна ўжо будзе канчаткова прынятая, бо яна прадугледжвае магчымасць для школ набыць абсталяванне, напрыклад біноклі і мікраскопы, звазіць дзяцей у навучальныя цэнтры, якія плануецца стварыць у запаведніках. Пачнецца гэты праект восенню.

**У вас ёсць ідэі? А ў нас — грошы...**

Трэцяя частка праекта актуальная ўжо сёння і можа быць цікавай для любога неабыякавага жыхара нашай краіны — ад пенсіянера і школьніка да старшыні выканкама. Яна прадугледжвае бязвыплатнае фінансаванне шэрагу мясцовых пачынаў у памерах ад 3 да 8 тысяч долараў ЗША. Кіраўнікі праекта заўважаюць, што гэта стане толькі пачаткам. Гэтая частка сумеснага праекта называецца "Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні". Яна была ўхвалена пастановай Савета Міністраў яшчэ ў снежні 2006 года, а зарэгістравана ў Міністэрстве эканомікі ў лістападзе 2008-га (№ 2/08/000381). Каб стаць яе ўдзельнікам, трэба зразумець яе сутнасць.

Праект заклікаты навучыць людзей аб'ядноўвацца і дзейнічаць разам дзеля рашэння агульных праблем. Гэтай навукай, між іншым, цудоўна валодалі нашы продкі. Яны талакой будавалі хаты, дарогі, гаці... Традыцыя дагэтуль захавалася ў некаторых вёсках, напрыклад, у Моталі Іванаўскай вобласці некалькі гадоў таму за некалькі месяцаў талакой паставілі дом жанчыне, якая пацярпела ад пажару.

Сёння міжнародныя арганізацыі заахвочваюць людзей па ўсім свеце ў сябе на месцах талакой вырашаць праблемы, якія датычацца ўсіх у гэтай мясцовасці, і разам з тым маюць экалагічную накіраванасць. Напрыклад, асвятленне вуліц за кошт альтэрнатыўных крыніц энергіі, павышэнне якасці пітной вады, пераход да арганічнага землекарыстання, забеспячэнне занятасці насельніцтва, садзейнічанне малому бізнэсу і г. д. Важна, каб рашэнне гэтых праблем несла ў сабе клопат пра будучыню вёскі, сельсавета, раёна, горада альбо рэгіёна. Вобраз жаданай будучыні — мэта ўсіх намаганняў сучаснай талакі.

**Разам з уладамі**

Па сутнасці, усё гэта не навіна. Пачатак міжнароднага руху, пра які ідзе размова, быў пакладзены яшчэ ў 1987 годзе, калі Міжнародная камісія па навакольным асяроддзі і развіцці ААН выступіла з дакладам "Наша агульная будучыня". Праз пяць гадоў 179 краін, у тым ліку Беларусь, падпісалі дакумент, які мае назву "Парадак дня на XXI стагоддзе". Ва ўступнай частцы яе сказана, што Парадак прысвечаны праблемам сённяшняга дня, а таксама мае на мэце падрыхтаваць свет да вырашэння праблем, з якімі ён сутыкнецца ў наступным стагоддзі.

З таго часу ў Беларусі пачалася работа па выкананні ўзятых на сябе абавязацельстваў. У

1996 годзе была распрацавана першая Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця нашай краіны. Цяпер такая стратэгія распрацоўваецца кожныя пяць гадоў на пятнаццацігадовы перыяд.

Акрамя Нацыянальных існуюць і мясцовыя стратэгіі развіцця, якія ў свеце прызнаныя найбольш эфектыўнымі, бо лічыцца, што пераўтвараць свет лепш за ўсё праз канкрэтныя дзеянні канкрэтных людзей. Такія стратэгіі, альбо Мясцовыя парадкі-21 таксама вядомыя ў нашай краіне з 1999 года. Першапраходцамі сталі старажытны Тураў і Дзіцячы аздараўленчы цэнтр "Надзея" (Вілейскі раён).

Назва "Парадак" звязана са звыклым для нас паняццем парадку дня, які вызначае любы сход, але тут маецца на ўвазе парадак больш доўгатэрміновы — на ўсё XXI стагоддзе. І на "сход" запрашаецца ўсё чалавецтва.

Сёння ў Беларусі каля 50 суполак самых розных памераў, ад таварыства домаўладальнікаў да сталіцы, уключыліся ў працэс распрацоўкі Мясцовых стратэгій развіцця — Мясцовых парадкаў-21. Гэтага мала — лічаць нацыянальныя і міжнародныя эксперты. Нягледзячы на тое, што за апошнія 10-15 гадоў гэты рух стаў вельмі значным у свеце, для большасці жыхароў Беларусі словазлучэнні "ўстойлівае развіццё" і "Мясцовы парадак-21" нічога не кажуць. Сумесны праект Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН заклікаааны змяніць сітуацыю. Па-першае, праінфармаваць, і па-другое, заахвоціць як мага больш людзей удзельнічаць у сусветным працэсе.

Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Беларусі да 2020 года, зацверджаная Саветам Міністраў, прадугледжвае, што рэгіянальныя і мясцовыя пачынанні, якія заклікаааны палепшыць сацыяльна-эканамічную, экалагічную, дэмаграфічную сітуацыі, захаваць помнікі гісторыі і культуры, будуць разглядацца ў якасці першасных кірункаў дзяржаўнай падтрымкі.

Цяпер кіраўнікі і эксперты праекта знаёмяць выканаўчыя ўлады, прыродаахоўныя, грамадскія арганізацыі, фермераў, настаўнікаў, гаспадароў аграсядзібаў, прадпрымальнікаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, краязнаўцаў, энтузіястаў — усіх, каму гэта цікава, з умовамі ўдзелу ў праекце. Адбыліся ўжо чатыры рэгіянальныя семінары: у Мінскай, Віцебскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. У найбліжэйшы час падобныя семінары адбудуцца ў іншых рэгіёнах Беларусі.

Адначасова праходзяць сустрэчы з кіраўнікамі адміністрацый усіх узроўняў, ад абласных да сельскіх, якія выказваюць зацікаўленасць у тым, каб праект пачаў працаваць на іх тэрыторыях.

Па выніках семінараў у штаб Сумеснага праекта ЕС і ПРААН (220114, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 110-504. E-mail: sesd@un.minsk.by. Тэл. 8(17) 267 20 21) ад усіх ахвотных накіроўваюцца так званыя лісты зацікаўленасці. Іх ужо напісалі тыя суполкі, якія маюць вопыт супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі: Дзісненскі край, Лепельскі і Вілейскі раёны, вёскі Камарова (Мядзельскі раён), Пераброддзе (Міёрскі раён), Ананіцкі і Дукорскі сельскія і Свіслацкі пасялковы саветы Пухавіцкага раёна...

Да восені будзе праведзены конкурс і адабраны 24 пілотныя (пробныя) тэрыторыі. Адабраным гарадам, раёнам і вёскам будзе аказана дапамога ў напісанні мясцовых стратэгій развіцця, а таксама фінансавая і іншая (навучанне, абмен вопытам, экспертыза) дапамога ў рэалізацыі тых альбо іншых пачынаў. Адна з асаблівасцяў лістоў зацікаўленасці — яны павінны быць падпісаны старшынёй выканкама адпаведнага ўзроўню. Бо важны прынцып праекта — супрацоўніцтва грамадства з уладамі.

Дарэчы, у лісце зацікаўленасці прапісана, што са свайго боку ўлады выказваюць гатоўнасць аказаць падтрымку і вылучыць мясцовыя рэсурсы ў якасці свайго ўкладу ў рэалізацыю сумесных праектаў. Маюцца на ўвазе памяшканні для сустрэч і семінараў, сумеснае фінансаванне мерапрыемстваў, іншыя магчымасці, прадугледжаныя мясцовай стратэгіяй развіцця.

**Зялёныя сцежкі**

Асобным радком у частцы "Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні" прапісана распрацоўка экалагічна арыентаваных турыстычных маршрутаў — так званых Зялёных сцежак. У англійскай транскрыпцыі — Грынвэйз (Greenways). У Беларусі ўжо ёсць некалькі такіх маршрутаў. "Звязда" пісала пра два найбольш распрацаваныя з іх — "Нёманскі шлях" у Лідскім раёне ("Зялёныя сцежкі сям'і Агаркаў", 22.01.09) і "Блакітныя каралі Расон" на Віцебшчыне ("Не чуваць там пра англійскі парламент", 09.08.08).

Зялёныя сцежкі — гэта турыстычныя маршруты пешшу альбо на безматорных відах транспарту: конях, платах, байдарках, веласіпедах. Яны пракладаюцца як правіла ўздоўж старажытных гандлёвых шляхоў, рэк, азёрных ланцужкоў, прыродных калідораў і аб'ядноўваюць мясцовыя славутасці рознага кшталту — ад цікавых людзей і бабровых хатак да ўнікальных храмаў і ландшафтаў.

Папулярнасць гэтага віду турызму расце. Сёння абодва названыя беларускія маршруты распісаны ўжо на ўсё лета. Зялёныя сцежкі падтрымліваюцца міжнароднымі арганізацыямі таму, што галоўныя іх прынцыпы супадаюць. Напрыклад, унёсак у абарону прыроднай і культурнай спадчыны, аб'яднанне краін і людзей, дапамога мясцоваму насельніцтву ў асэнсаванні сваёй унікальнасці, паляпшэнне якасці жыцця...

Турыст, які рухаецца па такой сцежцы, даведваецца пра асаблівасці прыроды гэтага рэгіёна, слухае спевы птушак, удыхае водар траў, кантактуе з рознымі людзьмі, купляе мясцовыя вырабы, знаёміцца з народнымі майстрамі, наведвае невялікія музеі, спыняецца ў гатэлях альбо на аграсядзібах... Тым самым ён не толькі ўзбагачаецца духоўна і эмацыянальна, але і падтрымлівае рэгіён, яго традыцыі, рамёствы, гаспадарку.

У рамках Сумеснага праекта ЕС і ПРААН магчыма фінансавая дапамога ў набыцці экалагічнага транспарту для вандроўнікаў па Зялёных сцежках (веласіпедаў, байдарак), ва ўсталяванні ўздоўж шляхоў шчытоў са схемамі, сметнікаў, у абсталяванні прыпынкаў, прычалаў, адным словам, у стварэнні інфраструктуры. А таксама — метадычная, інфармацыйная і экспертная дапамога.

**Не толькі турызм**

На семінары ў Гродне, ён адбыўся 29 мая, даволі вялікі акцэнт быў зроблены якраз на развіццё турызму. Але памылкова было б думаць, што турызм — асноўная тэма ў праекце.

— Тэме турызму прысвечана толькі частка дзейнасці ў межах праекта, прычым не самая вялікая, — тлумачыць эксперт кандыдат эканамічных навук Алег Сівагракаў. — Развіццю аграэкатурызму, Зялёных сцежак надаецца важнае значэнне, аднак няправільна было б пераўтварыць Беларусь у вузкаспецыялізаваную турыстычную краіну. Мясцовыя стратэгіі ўстойлівага развіцця, якія мы заклікаем распрацоўваць на тэрыторыях раёнаў, гарадоў, сельсаветаў, пасёлкаў альбо вёсак, маюць на ўвазе комплекснае развіццё ў тым ліку і прамысловасці, сельскай гаспадаркі і сацыяльнай сферы.

Мясцовыя стратэгіі развіцця — гэта працэс руху да паляпшэння сітуацыі на нейкай тэрыторыі. Пачынаць трэба са сходу і абмеркавання праблем, шляхоў іх вырашэння і перспектыў. Калі ўдасца зрабіць хоць бы гэта, і па выніках такога сходу запоўніць форму ліста зацікаўленасці, то ўжо ёсць шанц узяць удзел у конкурсе пілотных тэрыторый, а значыць і атрымаць дапамогу ў ажыццяўленні задум.

***Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.***

**Источник:** Звязда.-2009.-9 чэрв.-С.3.